**Гаўрылава С.В.**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*
*Мінск, Беларусь*

# КАМПЛЕКТАВАННЕ ФОНДАЎ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ У ХХ СТ. ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ СТАЎЛЕННЯ ГРАМАДСТВА ДА ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Як даводзіць Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, эфектыўнасць дзяржаўнай палітыкі ў сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны забяспечвае заканадаўчая база, якая пачала фарміравацца адразу пасля абвяшчэння незалежнасці Беларусі. На сённяшні дзень яна ўключае 9 Указаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Закон «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», пастановы Урада Беларусі, пастановы і загады Міністэрства культуры. Сямнаццаць іншых законаў утрымліваюць нормы, якія разглядаюць пытанні аховы спадчыны [1]. Прынцып прызнання гісторыка-культурнай спадчыны фактарам развіцця дзяржавы з'яўляецца асноватворным і прапісаны ў Законе. Адной з культурных форм, выпрацаваных чалавецтвам для захавання і трансляцыі культурнай спадчыны, з'яўляецца музей [8, с. 54]. Амаль палову (47 % ад агульнай колькасці [6]) усёй музейнай сеткі нашай рэспублікі складаюць музеі краязнаўчага профілю.

Асновай развіцця музейнай справы на беларускіх землях стала прыватнае збіральніцтва, на змену якому ў канцы XIX – пачатку XX ст. прыйшлі профільныя музеі. З развіццём краязнаўчага руху на беларускіх землях у паслярэвалюцыйны час менавіта прыватныя зборы часта станавіліся базай, на якой ствараліся музеі, у тым ліку і краязнаўчыя. Так, аснову фондаў сучаснага Віцебскага абласнога краязнаўчага музея на пачатку яго заснавання ў 1918 г. складаў прыватны калекцыйны збор А.Р. Брадоўскага, які налічваў больш за 10 тыс. адзінак захоўвання і быў падзелены на 40 тэматычных калекцый [7, с. 21]. Асновай музейнага збору служылі таксама калекцыі, сабраныя пры навучальных установах.

Акруговыя і раённыя таварыствы краязнаўства, пры якіх ствараліся адпаведныя музеі, ладзілі экспедыцыі і папаўнялі фонды музеяў каштоўнымі, часта ўнікальнымі матэрыяламі. Для прыкладу, сабраныя членамі Слуцкага таварыства (тады яшчэ камісіі беларусазнаўства) партрэты князёў Алелькавічаў, рукапіснае евангелле XVI ст., епітрахіль, посах і сярэбраная рыза XVI ст., кальвінская біблія берасцейскага выдання 1563 г. склалі аснову фондавага збору Слуцкага краязнаўчага музея [2, с. 72]. Акрамя арганізацыі экспедыцый па зборы матэрыяльных сведчанняў мясцовай гісторыі і культуры, таварыствы займаліся выяўленнем і захаваннем нематэрыяльнай культурнай спадчыны (запіс фальклору), распрацоўвалі спецыяльныя анкеты, прызначаныя для выяўлення помнікаў старажытнасці і прыроды. Для прыкладу, у Полацку дзейнасць камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва, краязнаўчага таварыства і краязнаўцаў-аматараў стварыла "фенаменальныя ўмовы для спалучэння музейнага будаўніцтва з музеефікацыяй гарадскога асяроддзя ..." [4, с. 10]. Праводзімая ўладамі палітыка ў сферы гістарычнай і культурнай спадчыны была накіравана на тое, каб зрабіць яе агульнадаступнай.

Варта заўважыць, што адным з асноўных напрамкаў дзейнасці краязнаўцаў было выяўленне, улік, ахова і выкарыстанне гісторыка-культурных каштоўнасцей, таму музейныя калекцыі на той час утрымлівалі арыгінальныя прадметы. Музейныя прадметы падзялялі па "маштабе" рэпрэзентацыі: практыкавалася перадача прадметаў агульнадзяржаўнага значэння з фондаў рэгіянальных музеяў ў цэнтральныя музеі БССР.

З пачаткам індустрыялізацыі фонды краязнаўчых музеяў пачалі папаўняцца макетамі, мадэлямі, дэталямі механізмаў, а з пашырэннем прапаганды вытворчых дасягненняў краіны – разнастайнымі схемамі, дыяграмамі і г.д. Часта мясцовыя музеі станавіліся свайго роду лабараторыямі па назіранні за прыродай, метэаралагічнай абстаноўкай, тапаграфіяй рэгіёна, што было выклікана актуалізацыяй адукацыйнай функцыі краязнаўчых музеяў, фонды якіх папаўняліся адпаведнымі матэрыяламі: картамі, табліцамі, гербарыямі і г.д. Крыніцай папаўнення фондаў былі і разнастайныя выстаўкі. Так, у канцы 1920-х гг. збор Барысаўскага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

краязнаўчага музея папоўніўся экспанатамі, якія дэманстраваліся на выстаўцы, прысвечанай пяцігоддзю стварэння барысаўскага гуртка натуралістаў [2, с. 86]. Гэта сведчыць аб тым, як хутка змянялася канцэпцыя камплектавання музейных збораў у залежнасці ад місіі музея, якая была вынікам агульнадзяржаўнай палітыкі, накіраванай ужо не на тое, каб “паказаць”, а на тое, каб “схаваць”. Музейныя фонды пачалі разглядацца як крыніцы прадметаў гісторыі і культуры, якія мелі “экспартную каштоўнасць” [2, с. 98]. Са складу музейных збораў вымалі гісторыка-культурныя каштоўнасці, якія адпраўлялі за мяжу.

У пачатку 1930-х гг. экспазіцыі краязнаўчых музеяў, якія сталі інструментам прапаганды задач сацыялістычнага будаўніцтва, ствараліся па аднолькавай для ўсіх схеме з загадзя ўпісанымі ў яе музейнымі прадметамі, якія павінны былі ілюстраваць, а не рэпрэзентаваць. У фонды музеяў сталі ў вялікай колькасці паступаць навукова-дапаможныя матэрыялы.

За перыяд Вялікай Айчыннай вайны музейныя зборы моцна пацярпелі, сабраныя ў іх гістарычныя і культурныя каштоўнасці ў большасці сваёй былі вывезены з рэспублікі або проста знішчаны. Ва ўмовах пасляваеннага аднаўлення задачай краязнаўчых музеяў стала ахова і збіранне гісторыка-культурнай спадчыны свайго рэгіёна. Супрацоўнікі музеяў арганізоўвалі шматлікія экспедыцыі, што садзейнічала папаўненню фондаў помнікамі рэгіянальнага значэння. Аднак камплектаванне фондаў праводзілася ў адпаведнасці са структурай экспазіцыі. Перавага ў экспазіцыйным паказе аддавалася перыяду сацыялістычнага будаўніцтва, а ў музейныя зборы паступалі мадэлі, макеты, дыяграмы, дакументы і фотадакументы, а таксама творы мастацтва адпаведнай тэматыкі. Так, на базе экспанатаў Палескай абласной выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі і этнаграфічных матэрыялаў, сабраных у вобласці былі створаны фонды новага Палескага абласнога краязнаўчага музея [5, с. 372]. Найбольшая колькасць арыгінальных прадметаў рэпрэзентавалі тэму Вялікай Айчыннай вайны, бо камплектаванне праводзілася “па гарачых слядах”.

Перыяд “адлігі” ўнёс значныя змены музейную справу рэспублікі. Музейныя супрацоўнікі ладзілі археалагічныя раскопкі, этнаграфічныя экспедыцыі, тым самым папаўняючы фонды помнікамі гісторыі і культуры, аб’ектамі прыроды, а самі зборы разглядаліся як скарбніцы, у якіх гэтыя помнікі захоўваюцца. Распрацоўка заканадаўчых актаў у сферы аховы гісторыка-культурнай спадчыны спрыяла з’яўленню метадычных рэкамендацый па арганізацыі фондавай работы ў музеях, а таксама кантролю за наяўнасцю і станам помнікаў, якія ўтрымлівалі музейныя фонды.

З актывізацыяй краязнаўчага руху ў рэспубліцы пры навучальных установах і ва ўласных асоб пачалі фарміравацца калекцыі, якія пазней станавіліся асновай стварэння новага краязнаўчага музея. Так, на базе калекцыі краязнаўцы быў створаны фонд Крычаўскага раённага краязнаўчага музея [5, с. 321], на базе этнаграфічнай калекцыі, сабранай студэнтамі Маладзечанскага настаўніцкага інстытута – Мінскі абласны краязнаўчы музей [3, с. 72].

У канцы 1980-х – пач. 1990-х гг. абуджэнне рэлігійнага жыцця ў краіне высунула на першы план праблему вяртання культавых прадметаў вернікам, а гэта значыць, выключэнне іх з музейнага збору. Сутнасны дуалізм такіх прадметаў, якія для адных з’яўляюцца элементамі адпраўлення рэлігійных абрадаў, а для другіх – узорамі мастацтва, да сённяшняга дня выклікае гарачыя дыскусіі (з апошняга – вяртанне Царкве Ісаакіеўскага сабора ў Санкт-Пецярбургу). Краязнаўчыя музеі Беларусі так ці інакш пераадольвалі цяжкасці постсавецкага перыяду, і на хвалі нацыянальнага адраджэння ствараліся новыя музеі, фонды якіх налічвалі тысячы матэрыяльных сведчанняў развіцця беларускай культуры і гісторыі.

Сёння побач з праблемай уліку і арганізацыі захаванасці музейнага фонду актуальнай з’яўляецца праблема камплектавання фондаў прадметамі сучаснасці. Яе пастаноўка выклікана развіццём музеялагічнай думкі, паводле якой музейная мадэль адлюстравае ў пераважнай большасці выпадкаў мінулае, што дазваляе аднесці музей (у тым ліку і краязнаўчы) да гістарычнага інстытута, сукупнасць прадстаўленых у ім феноменаў – да спадчыны (культуры, прыроды); сучасныя рэаліі вельмі хутка становяцца фактамі гісторыі, мінулага [9, с. 60], а таму пераходзяць у катэгорыю “спадчына” і павінны быць прадстаўлены ў музеі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура

1. Гісторыка-культурная спадчына Беларусі // Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа:http://www.kultura.by/page/g-storyka-kulturnaya-spadchyna-belarus. – Дата доступа: 20.09.2015.
2. Гужалоўскі, А.А. Музеі Беларусі (1918–1941 гг.) / А.А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2002. – 176 с.
3. Гужалоўскі, А.А. Музеі Беларусі (1941–1991 гг.) / А.А. Гужалоўскі. – Мінск : НАРБ, 2004,-218 с.
4. Джумантаева, Т.А. Музеефікацыя культурнай прасторы Полацка: традыцыі і інавацыі: аўтарэф. дыс. ... канд. культуралогіі: 24.00.03 / Т.А. Джумантаева; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск, 2011. – 28 с.
5. Музеі Беларусі = Музеи Беларуси / рэд. савет: Г. П. Пашкоў, Л. В. Календа, М. Г. Нікіцін. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2008. – 560 с. : іл.
6. Музейныя ўстановы // Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа:http://www.kultura.by/page/muzeinyya-stanovy. – Дата доступа: 20.09.2015.
7. Савіцкі, Г. Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею – 90 гадоў / Г. Савіцкі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 10. – С. 21–26.
8. Словарь актуальных музейных терминов // Музей. – 2009. – № 5. – С. 47–68.
9. Сотникова, С.Н. Музей в меняющемся мире / С.Н. Сотникова // Обсерватория культуры. – 2007. – № 2. – С. 60–66.



**Давидович Л.Ч., Ганский В.А.**
*Полоцкий государственный университет*
*Полоцк, Беларусь*


## ОСОБЕННОСТИ ФУНКЦИОНИРОВАНИЯ ТУРИСТИЧЕСКИХ КОМПЛЕКСОВ В ПРИГРАНИЧНЫХ РАЙОНАХ[17]

Границы и примыкающие к ним территории являются удобным местом расположения промышленных предприятий и объектов туризма, а также особо охраняемых природных территорий. Социальные и экономические различия между соседствующими территориями разных стран также влияют на существование там контрабанды товаров и незаконную миграцию. Границы разделяют разные политические системы, характеризующиеся различными административным делением и освоением пространства. Они влияют на развитие туризма через: мотивы и решения о путешествиях, развитие туристической инфраструктуры, маркетинг и рекламу региона. Границы и их роль в качестве пространственных барьеров оказывают влияние, прежде всего, на уменьшение потоков и изменение форм и масштабов хозяйственного освоения территории.

Периферию часто отождествляют с территориями, расположенными рядом с государственными границами. В географическом смысле приграничная территория всегда является периферийной. Периферийный регион является одним из двух основных типов туристических регионов (вторым является урбанистический регион, возникающий вокруг крупных населенных пунктов – городов и агломераций). Периферийные рекреационно-туристические регионы основываются на предложении местных объектов туристического интереса с высокой степенью аттрактивности и качества и ориентированы на продолжительный отдых и туризм, связанный чаще всего с отпусками и каникулами. Периферийные регионы конкурируют друг с другом как в экологической, так и в антропологической плоскости, а также возможностями оздоровления (курорты).

Взаимосвязь между туризмом и политическими границами описал в 2004 г. Дж.Д. Тимоти, выделив границы как барьеры (a), дестинации (b) и элементы модификации пространство туристической (c) (рис. 1). К этим трем видам взаимосвязи можно добавить четвертый: границы, создающие эффект синергии и пространственную интеграцию (и социальную, и экономическую) смежных областей.

Так же, как и для других видов хозяйственной активности человека, для туризма границы представляют собой барьеры. Эти барьеры оказывают особое влияние на туристические потоки и расположение элементов туристического пространства. Они влияют


[17] Исследование проведено в рамках проекта НИР «Развитие туризма в приграничных районах Республики Беларусь: теоретико-методологические основы и направления интенсификации», выполняемого при финансовой поддержке Белорусского республиканского фонда фундаментальных исследований (договор №Г15М-123 от 04.05.2015 г.).




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ